Д. В. ГЕРАСІМЁНАК

# КАНСЕРВАЦЫЯ І РЭСТАЎРАЦЫЯ ЯК ПАПЯРЭДНІК І ГАЛОЎНАЯ ЎМОВА МУЗЕЕФІКАЦЫІ СЯДЗІБНА-ПАРКАВЫХ КОМПЛЕКСАЎ

На сучасным этапе сацыякультурнага развіцця сядзібна-паркавыя комплексы нярэдка з'яўляюцца аб'ектамі музеефікацыі, таму што галоўная іх частка – помнікі архітэктуры. У многіх выпадках (асабліва пры падрыхтоўцы помніка да дэманстрацыі ў якасці самастойнага аб'екта музейнага паказу) іх музеефікацыя зводзіцца да правядзення рэстаўрацыйных работ. Працэс рэстаўрацыі складаны і патрабуе спецыяльных ведаў і прафесійнага вопыту. Роля музея праяўляецца галоўным чынам у інтэрпрэтацыі культурнага, гістарычнага, мастацкага значэння помніка музейнымі сродкамі. Распрацоўка канцэпцый і праектаў рэстаўрацыі, інтэрпрэтацыі, актуалізацыі, папулярызацыі праводзіцца самім музеем або пры яго непасрэдным удзеле.

Пры адсутнасці спецыялізаванага рэстаўрацыйнага аддзела супрацоўнікі музея павінны ўдзельнічаць у абмеркаванні лёсу аб'екта на ўсіх этапах і кантраляваць адпаведнасць рашэнняў, прынятых рэстаўрацыйнымі арганізацыямі, задачам і асноўным прынцыпам музейнай этыкі. У апошняе дзесяцігоддзе вызначылася тэндэнцыя далучаць да абмеркавання грамадскую супольнасць, а не толькі спецыялістаў у справе рэстаўрацыі. Фарміруецца так званая кааліцыя ўплыву, якая вызначае адпаведнасць правядзення рэстаўрацыйных работ нормам дзейнага заканадаўства.

У міжнароднай практыцы склаўся галоўны прынцып рэстаўрацыі, сфармуляваны ў Венецыянскай хартыі на II Міжнародным кангрэсе архітэктараў і тэхнічных спецыялістаў па гістарычных помніках, які адбыўся ў Венецыі ў 1964 г. Адзначаецца прыярытэт аўтэнтычнасці і выяўленне гістарычнай і эстэтычнай каштоўнасці помніка [4].

Такі падыход сфарміраваўся ў выніку амаль стогадовай тэарэтычнай і практычнай распрацоўкі праблемы, аднак сёння выконваецца не заўсёды. Адступленне ад Венецыянскай хартыі было выклікана ў першую чаргу пашырэннем тэрміна «пом-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нік», які ўключае не толькі адзінкавыя помнікі архітэктуры, але і ансамблі, буйныя горадабудаўнічыя ўтварэнні, фрагменты навакольнага асяроддзя, што паставіла перад рэстаўратарамі новыя задачы. Вызначэнне «помнік» аўтаматычна надае каштоўнасць аб'екту гісторыка-культурнай спадчыны. Сёння на змену ўяўленню аб рэстаўрацыі як суцэльным аднастайным працэсе прыйшло яго разуменне як складанага, неаднароднага, раздзеленага на розныя віды дзейнасці.

Асноўнымі рэстаўрацыйнымі метадамі з'яўляюцца кансервацыя і аналітычны метад, як выключэнне дапускаецца сінтэтычны метад [3, с. 53].

У аснове *кансервацыі* ляжыць замацаванне каштоўнасці помніка з усімі наслаеннямі, якія з'явіліся за час яго існавання. Пад кансервацыяй разумеюць таксама этап працэсу рэстаўрацыі, на якім забяспечваецца стабілізацыя стану і захаванне матэрыяльнай асновы помніка. Да кансервацыйных работ адносяцца мерапрыемствы па часовым захаванні збудаванняў, якія знаходзяцца ў аварыйным стане, умацаванне падмуркаў і апорных канструкцый, структурнае ўмацаванне сцен, стабілізацыя тэмпературна-вільготнаснага рэжыму. Для шэрагу аб'ектаў (помнікі глыбокай старажытнасці; помнікі, у якіх пазнейшыя перабудовы і напластаванні ўяўляюць значную цікавасць; помнікі, структурныя элементы якіх з'яўляюцца творамі дэкаратыўна-прыкладнога або выяўленчага мастацтва) кансервацыя прызнаецца не толькі пажаданым, але адзіна магчымым метадам.

Кансервацыйныя работы праводзяць з выкарыстаннем прынцыпу максімальнага захавання аўтэнтычнага матэрыялу помніка. Калі замена пашкоджанеяў з'яўляецца непазбежнай, яна ажыццяўляецца будаўнічымі метадамі, набліжанымі да тых, якія ўжываліся пры ўзвядзенні помніка. З аднаўленчых метадаў у рамках кансервацыі дапускаецца толькі *анастылёз* – устаноўка старажытных дэталяў на іх ранейшае месца.

Калі помнік моцна скажоны, рэстаўратары імкнуцца выявіць і зрабіць даступнымі для агляду найбольш важныя з гістарычнага і мастацкага пункта гледжання фрагменты. Пры кансервацыі руін уладкоўваюцца водаадводы, робяцца назіральныя пляцоўкі, ахоўныя пакрыцці па перыметры сцен, праводзіцца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

замацаванне збудавання, што часткова захавалася, шляхам вывядзення над узроўнем зямлі сцен, запаўнення страт муроўкі, пазначэння месцаў незахаваных элементаў. Рэстаўратар імкнецца пакінуць адчуванне старажытнасці, якое з'яўляецца важным фактарам эмацыянальнага і эстэтычнага ўспрымання помніка.

Прыкладамі правядзення кансервацыйных работ могуць служыць *сядзібы Рэйтанаў* у в. Грушаўка, *Войніч-Сенажэцкіх* у в. Хальч, а таксама *палацава-замкавы комплекс у аг. Гальшаны* Ашмянскага раёна (Гальшанскі замак) – былая рэзідэнцыя прадстаўнікоў адной з галін магнацкага роду Сапегаў. Мураваны замак, узведзены ў першай палове XVII ст., кампазіцыяй аддалена нагадваў Мірскі замак, уяўляў прамавугольны будынак. Жылыя карпусы з вежамі на вуглах утваралі замкнёны квадратны двор. Магутныя абарончыя сцены, характэрныя для замкавага будаўніцтва XVI ст., у Гальшанах саступілі месца фасаду жылога дома. Замак неаднаразова быў разбураны і перабудаваны, што значна змяніла яго знешні выгляд і аб'ёмна-прасторавую кампазіцыю (страчаны галерэі, дэкаратыўнае афармленне сцен, прыбудаваны да паўночна-заходняга і паўднёва-ўсходняга карпусоў дзве пяціграннныя вежачкі) [1, с. 102]. Навуковых даных для поўнага ўзнаўлення помніка недастаткова. Гэтыя абставіны абумовілі правядзенне кансервацыйных работ на месцы помніка.

Пры выкарыстанні *аналітычнага метаду (фрагментарная рэстаўрацыя)* помнік разглядаецца перш за ўсё як гістарычная крыніца. Дапускаецца ўнясенне нязначных змяненняў. Ужыванне гэтага метаду абумоўлена імкненнем замацаваць і захаваць форму, сляды якой былі выяўлены на помніку, даць поўнае і нагляднае ўяўленне аб архітэктуры збудавання. Часам фрагментарная рэстаўрацыя неабходна для забеспячэння захаванасці помніка. Адрозненне гэтага метаду ад сінтэтычнага (цэласнай рэстаўрацыі) не столькі колькаснае, колькі якаснае, мэтавае. Мэтай фрагментарнай рэстаўрацыі становіцца поўнае выяўленне і захаванне асаблівасцей архітэктуры, канструкцыйных дэталяў, будаўнічай гісторыі помніка [3, с. 54].

У працэсе фрагментарнай рэстаўрацыі вылучаюць два этапы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Першы – раскрыццё помніка, гэта значыць выдаленне пазнейшых, скажаючых яго і не ўяўляючых канструкцыйнай і гістарычнай каштоўнасці элементаў. Рашэнне аб раскрыцці прымаецца саветам высокакваліфікаваных спецыялістаў пры наяўнасці неабвержных доказаў таго, што выдаляемыя фрагменты не ўтрымліваюць у схаваным выглядзе рэштак каштоўных пазнейшых напластаванняў і што іх прыбранне раскрые каштоўныя раннія фрагменты. Раскрыццё недапушчальна, калі яно пагражае захаванасці помніка.

Другі этап – аднаўленне страчаных элементаў – ажыццяўляецца на падставе бясспрэчных доказаў, атрыманых у выніку натурнага даследавання помніка. Гістарычныя крыніцы, у тым ліку выяўленчыя, што дапамагаюць пры вывучэнні помніка, не з’яўляюцца доказнай крыніцай для аднаўлення элемента, таму што гістарычнай каштоўнасцю валодае не толькі аўтарская задума, але і яе інтэрпрэтацыя пры ўвасабленні ў натуры. Адно з асноўных патрабаванняў аналітычнага метаду – уменне своечасова спыніцца, каб не знішчыць адчуванне аўтэнтычнасці і не надаць будынку аблічча наваўтварэння.

Фрагментарная рэстаўрацыя была выкарыстана пры аднаўленні *сядзібы М. К. Агінскага* ў аг. Залессе, *сядзібы Нямцэвічаў* у в. Скокі, *Ружанскага палаца* (г. п. Ружаны Пружанскага раёна), аднаго з найбуйнейшых палацавых комплексаў Беларусі XVII–XVIII ст., што, як і Гальшанскі замак, з’яўляўся ўласнасцю князёў Сапегаў. Палац быў пабудаваны ў пераходным стылі ад барока да класіцызму архітэктарам Я. С. Бекерам на аснове муроў палаца пачатку XVII ст. Галоўны корпус уяўляў кампактны двухпавярховы прастакутны ў плане будынак пад высокім мансардавым «французскім» дахам. Галоўны фасад у трынаццаць вокнаў у цэнтральнай частцы вылучаўся ўзнятым на другі паверх прысценным порцікам з дзвюх пар калон і пілястраў, завершаным высокім трохкутным франтонам, запоўненым скульптурным барэльефам і ўвянчаным па вуглах гратэскнай скульптурай. На тыльным фасадзе порціку адпавядала шырокая дзесяцікалонная тэраса, на якую выходзілі вокны-дзверы бальнай залы.

Палацавы комплекс згарэў у 1914 г. У 1930 г. быў часткова рэстаўраваны. Падчас Другой сусветнай вайны разбураны

РЕПОЗИТОРИЙ БГТУ

канчаткова. Захаваліся толькі рэшткі асноўных будынкаў (галоўнага і ўсходняга карпусоў), аркады, уязная арка і флігелі па яе баках [1, с. 411]. З 2008 г. на тэрыторыі палацавага комплексу стартавалі раскопкі і рэстаўрацыя. Аднаўленне палацавага ансамбля пачалося з брамы і бакавых флігеляў, якія прылягаюць да яе. Да цяперашняга часу адрэстаўраваны заходні і ўсходні флігелі, адчынены музей, адкрыта ўзнаўленне паўднёвага корпуса палаца [2].

*Сінтэтычны метад (цэласная рэстаўрацыя)* прадугледжвае права рэстаўратара на ўзнаўленне «першапачатковага» або «аптымальнага» аблічча помніка з выкарыстаннем гіпотэз і аналогій. Яго мэта – раскрыццё асаблівасцей і выяўленне істотных рыс старажытнага збудавання як помніка гісторыі і культуры. На жаль, як у мінулым, так і цяпер гэты метад часам ператвараецца ў неапраўданыя стылізатарскія фальсіфікацыі. Сінтэтычны метад прызнаецца дапушчальным, калі цэласная рэстаўрацыя шырока ўжываецца ў дачыненні да помнікаў, якія падвергліся разбурэнню параўнальна нядаўна, як правіла, у выніку стыхійных бедстваў або ваенных дзеянняў, і па-ранейшаму застаюцца ў памяці сучаснікаў як бы рэальна існуючымі. Характэрным прыкладам сінтэтычнага метаду можа служыць адраджэнне помнікаў, якія пацярпелі ў Вялікай Айчыннай вайне. Нярэдка рашэнне аб цэласнай рэстаўрацыі прымаецца зыходзячы з горадабудаўнічых інтарэсаў (калі згублены або моцна скажоны помнік адыгрывае ключавую ролю ў гарадскім ансамблі) [3, с. 55–56].

Выкарыстанне сінтэтычнага метаду стала апраўданым пры рэстаўрацыі *сядзібы Козел-Паклеўскіх* (аг. Красны Бераг Жлобінскага р-на) – помніка архітэктуры і садова-паркавага мастацтва канца XIX ст. у стылі эклектыкі. Інтэр'ер і фасад сядзібнага дома складана аднавіць на момант росквіту азначанага помніка гісторыка-культурнай спадчыны.

Сядзібна-паркавы комплекс Козел-Паклеўскіх уключае сядзібны дом, флігель, гаспадарчыя пабудовы, мураваную агароджу з брамай, парк. Галоўным архітэктурным элементам комплексу і цэнтрам яго кампазіцыі з'яўляецца палац, Г-падобны ў плане асіметрычны двухпавярховы мураваны будынак, узведзены ў стылі гістарызму з выкарыстаннем элементаў

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

готыкі, рэнесансу, ампіру і мадэрну. Фасады палаца і яго дах вызначаюцца складанай канфігурацыяй, якая спалучае аб'ёмы асноўнага корпуса з рызалітамі, эркерамі і аб'ёмам бальнай залы. Асабліва вылучаюцца на асноўным фасадзе двух-, трох- і чатырохгранныя руставаныя эркеры з контрфорсамі і шатровымі гранёнымі завяршэннямі. Галоўны ўваход вырашаны ў выглядзе манументальнай тэрасы на масіўных пілонах са стрэльчатымі арачнымі праёмамі паміж імі [1, с. 487]. З 2008 г. сядзібны дом знаходзіўся на рэстаўрацыі. У 2015 г. у ім адкрыўся музей [5].

Для захавання нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей могуць выконвацца і іншыя работы, накіраваныя на забеспячэнне належнага іх утрымання і выкарыстання, якія не парушаюць цэласнасці, агульнага кампазіцыйнага рашэння і (або) гістарычнага характару размяшчэння ў навакольным асяроддзі. У выключных выпадках праводзіцца навуковая рэканструкцыя страчаных помнікаў (будынкі ратуш у Магілёве, Мінску, *сядзіба Т. Касцюшкі ў Мерачоўшчыне* і інш.).

Музеефікаваны аб'ект уключае розныя аспекты культурнай, гістарычнай, мастацкай каштоўнасці: характарызуецца як помнік гісторыі матэрыяльнай культуры, помнік гісторыі мастацтва, мемарыяльны аб'ект, помнік паўсядзённага жыцця, этнаграфіі і г. д. Каб выбраць рэстаўрацыйны метад, важна вырашыць, які з аспектаў будзе дамінаваць. З гэтым звязаны і асноўныя падыходы да далейшага ўключэння помнікаў гісторыі і культуры ў актуальную сацыякультурную прастору. Тым не менш у якасці пераважнага альбо адзінага магчымага сродку актуалізацыі спадчыны разглядаецца яе функцыянаванне ў межах музея, таму што дадзеная ўстанова культуры прадугледжвае захаванне матэрыяльных і нематэрыяльных праяў чалавечай дзейнасці і іх перадачу будучым пакаленням.

*1.* Архітэктура Беларусі : энцыкл. давед. / рэдкал.: А. А. Воінаў [і інш.]. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя Петруся Броўкі, 1993. – 620 с.

*2.* Информация о реставрации Ружанского дворцового комплекса рода Сапег [Электронный ресурс] // Ружанский дворцовый комплекс рода Сапег. – Режим доступа: http://rozana.by/restavratsionnye-raboty/. – Дата доступа: 04.05.2021.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3. *Каулен, М. Е.* Музеефикация историко-культурного наследия России / М. Е. Каулен. – М. : Этерна, 2012. – 432 с.

4. Международная хартия по консервации и реставрации памятников и достопримечательных мест = International Charter for the Conservation and Restoration of Monuments and Sites, Venice Charter [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://docs.google.com/document/d/1hz0lOc8 BNZC9EcUhbfBcdjZvT0 sZImcPZzMC6fIOlj4/edit. – Дата доступа: 04.05.2021.

5. Усадьба Козел-Поклевских в агрогородке Красный Берег Жлобинского района отмечает 125-летний юбилей [Электронный ресурс] // Сетевое издание SB.BY. – Режим доступа: https://www.sb.by/articles/dvorets-priglashaet-na-mazurku.html. – Дата доступа: 04.05.2021.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ